4. *Zelezniak, A.* Gubernia minska pod wzgedem muzykalnym // Ruch Myzyczny. – 1858. – № 50. – S. 67.

П. М. САПОЦЬКА

# ДА ГІСТОРЫІ ПЕРШАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА ЛІТОЎСКАГА СПЕКТАКЛЯ «АМЕРЫКА Ў ЛАЗНІ»




Гісторыя літоўскага тэатра, якая распачалася ў XVI ст., прайшла мноства этапаў свайго развіцця: пастаноўкі ў старажытных замках з удзелам замежных акцёраў, драматычныя, оперныя і балетныя трупы пры дварах князёў і вяльможаў, гарадскі тэатр, падпольны тэатр і таемныя літоўскія вечары, аматарскія групы і драматычныя гурткі, прафесійны тэатр.

Адной з найважнейшых вех у гісторыі тэатральнага мастацтва Літвы з’яўляецца пастаноўка першага спектакля на літоўскай мове «Амерыка ў лазні» («У Амерыку», «Амерыка жаданая») па п’есе Юозаса Вілкутайціса-Кятуракіса ў Паланзе.

Палангу ў 1824 г. набылі графы Тышкевічы, якія ўзвялі тут палац у стылі неарэнесанса, разбілі парк, запрасіўшы для гэтага вядомага французскага ландшафтнага архітэктара Эдуарда Франсуа Андрэ. Таксама былі пабудаваны летні тэатр, некалькі дачных кварталаў, лячэбніцы, купальні, кандытарскія, гімнастычная зала. Тым самым Тышкевічы стварылі адзін з найбуйнейшых культурных і эканамічных цэнтраў Літвы і Еўропы.

Камедыя-вадэвіль Вілкутайціса-Кятуракіса высмейвае людзей, якія жадаюць эміграваць у Амерыку. Галоўны герой вадэвіля – сельскі кравец Вінцас – прапануе аднаму заможнаму землеробу Антанасу пазычыць свайму збяднеламу суседу некалькі тысяч рублёў і атрымаць за гэта ў жонкі яго дачку Аготу з вялікім пасагам, пасля прапанаваўшы апошняй скрасці гэтыя грошы і разам бегчы ў Амерыку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спектакль быў пастаўлены, з аднаго боку, у вельмі складаны час для літоўскай культуры, які характарызуецца забаронай на літоўскую мову, літоўскі друк, літоўскія школы з-за прыгнёту Расійскай імперыі, а з другога, – пастаноўка адбылася на піку нацыянальнага руху канца XIX – пачатку XX стст.

Камедыя выйшла з-пад пяра Кятуракіса ў 1895 г. і мела некалькі назваў «Амерыка ў лазні», «У Амерыку» і «Амерыка жаданая». Першапачаткова яе ставілі на таемных літоўскіх вечарынах на тэрыторыі Літвы, якая ў той час уваходзіла ў склад Расійскай імперыі, і на вечарынах літоўскіх таварыстваў у краінах Еўропы і Злучаных Штатаў Амерыкі. А ў 1899 г. Паланга стала сведкай нараджэння новага маштабнага адкрыцця ў сферы мастацтва.

«Спектакль настолькі палюбіўся літоўскай, савецкай, а затым рускай і еўрапейскай публіцы, што зведаў вялікую колькасць тэатральных сезонаў з рэгулярнымі аншлагамі ў розных тэатрах краіны. І на сённяшні дзень «Амерыка ў лазні» лічыцца сімвалам свабоднага і самабытнага літоўскага тэатра» [2]. Спектакль мноства разоў ставіўся на аматарскіх і прафесійных сцэнах ад Масквы да Чыкага.

Сам Юозас Вілкутайціс-Кятуракіс (1869–1948) – выбітны юрыст і грамадскі дзеяч, у розны час працаваў у Марыямпальскай судовай акрузе, суддзёй у Сейнае, натарыусам у Прэнае. Кавалер ордэна Вялікага Князя Літоўскага Гедыміна. Юозас сваёй адукацыяй займаўся сам, і яго ведаў хапіла, каб займаць высокія пасады, а таксама кіраваць вялікай гаспадаркай, што засталася ад бацькі. Аднак увесь вольны час ён прысвячаў літаратуры, складаючы розныя творы. Кятуракіс – псеўданім, які ў перакладзе азначае «чатырохвокі» [1].

Вялікім пытаннем для даследчыкаў гісторыі тэатра застаецца сапраўднае аўтарства п’есы. Прозвішча, якім падпісаўся драматург, вядома – Вілкутайціс, а імя – не. Аднак прозвішча Вілкутайціс меў не толькі Юозас, але і яго старэйшы брат Антанас. Апошні з адзнакай скончыў матэматычны факультэт Маскоўскага ўніверсітэта, Санкт-Пецярбургскі інстытут інжынераў шляхоў зносін, будаваў чыгункі ў Закаўказзе. Аб сваёй роднай Літве напісаў шэраг публіцыстычных артыкулаў, пераклаў на літоўскую мову частку п’есы Льва Талстога «Власть тьмы».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Істотнай дэталлю спрэчкі з'яўляецца той факт, што «Юозас гасцяваў у свайго старэйшага брата на Каўказе незадоўга да першай пастаноўкі камедыі ў 1894 годзе. Як лёгка выказаць здагадку, так і цяжка адмаўляць, што п'еса абмяркоўвалася і, можа быць, пісалася там» [3]. Магчыма, адзін з самых папулярных спектакляў у гісторыі літоўскага тэатра – вынік творчасці абодвух братоў.

Разам з тым, афіцыйнае літоўскае мастацтвазнаўства, падмацаванае аўтарытэтнымі літоўскімі энцыклапедычнымі выданнямі, прызнала аўтарам легендарнай камедыі Юозаса Вілкутайціса-Кятуракіса.

Важнай вяхой у гісторыі спектакля стала яго пастаноўка ў 1982 г. у Каўнаскім драматычным тэатры вядомым рэжысёрам Валдасам Ленцявічусам – выпускніком Ленінградскага дзяржаўнага інстытута тэатра музыкі і кінематаграфіі, які працаваў рэжысёрам Ленінградскага тэатра імя В. Ф. Камісаржэўскай і Каўнаскага драматычнага тэатра. Ролі ў спектаклі выканалі выдатныя акцёры, Рэгіна Варнайтэ народная артыстка Літвы, Альгірдас Пінтукас – ганаровы грамадзянін горада Каўнаса, кавалер ордэна Вітаўта Вялікага, Антанас Жякіс – член Саюза пісьменнікаў Літвы, Міле Шаблаускайтэ – лаўрэат міжнародных фестываляў і іншыя. Музыку да спектакля напісаў кампазітар Макачынас Тэйсуціс Антанас – прафесар Літоўскай акадэміі музыкі і тэатра, лаўрэат Рэспубліканскай прэміі імя С. Шымкуса.

Спектакль стаў такім дасягненнем літоўскай культуры, што ў яго гонар штогод у сярэдзіне жніўня ў Паланзе праводзіцца Фестываль аматараў тэатра «Saules takas» («Сонечная сцежка») – адной з найбольш яскравых падзей у тэатральным жыцці сучаснай Літвы. У горадзе Прэнай ў памяць аб Юозасе Вілкутайцісе-Кятуракісе адкрыта мемарыяльная дошка работы скульптара Гедэмінаса Пекураса. Адзначаючы 95-годдзе незалежнага натарыята, Натарыяльная палата Літвы абвясціла 2014 год Годам Юозаса Вілкутайціса-Кятуракіса. Таксама вышэй названая арганізацыя заснавала медаль імя драматурга і ўручае яе асобам, якія ўнеслі вялікі ўклад у развіццё юрыспрудэнцыі, прасоўванне каштоўнасцей прававой культуры і ўмацаванне натарыята, а таксама грамадскім дзеячам. Адным з уладальнікаў медаля стала легендарная актрыса тэатра і кіно

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэгіна Варнайтэ, якая сыграла ў спектаклі «Амерыка ў лазні». Асобны куток Мемарыяльнай сядзібы першага бургамістра Палангі Ёнаса Шлюпаса прысвечаны гісторыі спектакля.

Спектакль і па сённяшні дзень захоўвае лідзіруючыя пазіцыі ў рэпертуары Каўнаскага дзяржаўнага драматычнага тэатра; квіткі на ўсе яго паказы набываюцца загадзя. Спектакль выконваецца ўжо не адным складам трупы тэатра.

---

1. *Балдецкий, Витольд.* Кятуракис. Америка желанная. Комедия в трех действиях [Электронный ресурс] / Витольд Балдецкий. – Режим доступа: https://www.proza.ru/2006/07/13-254. – Дата доступа: 01.02.2018.

2. *Вілкутайціс, Ю.* Амэрыка жаданая / Ю. Вілкутайціс. – М. : АСТ, 2006. – 64 с.

3. Тэатр у Літве [Электронны рэсурс] / Інфармацыйны партал «Усё пра Літву». – Вільнюс, 2016. – Рэжым доступу: http://www.olitve.ru/kultura-litvy/teatr. – Дата доступу: 15.07.2016.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ